**УДК 81'25**

# СПЕЦЫФІКА МАСТАЦКАГА ПЕРАКЛАДУ: ЛІНГВІСТЫЧНЫ І ЭКСТРАЛІНГВІСТЫЧНЫ АСПЕКТЫ

***Г.М. СТАРАСЦІНА***
***(Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова)***
***a.m-star@mail.ru***

*Даследуецца спецыфіка мастацкага перакладу. Разглядаецца працэс фарміравання лінгвістычнай тэорыі. Адзначаецца, што праблема мастацкага перакладу з'яўляецца комплекснай, павінна вывучацца ўсебакова і абапірацца на дадзеныя сучаснага мовазнаўства. Пры перакладзе мастацкага твора неабходна ўлічваць і экстралінгвістычную інфармацыю: асаблівасці эпохі, індывідуальны стыль аўтара, асаблівасці культуры пэўнага народа. Падкрэсліваецца, што пераклад мастацкай літаратуры павінен быць максімальна адэкватным і ў перадачы эстэтычнай вартасці арыгінала. Разглядаюцца моўныя адзінкі, якія маюць нацыянальна-культурную семантыку, адлюстроўваюць час стварэння твора, індывідуальную манеру пісьменніка. Робіцца выснова, што пры ажыццяўленні працэсу перакладу мастацкага тэксту неабходна ўлічваць як лінгвістычныя, так і экстралінгвістычныя фактары.*

***Ключавыя словы:*** *лінгвістычная тэорыя перакладу, мастацкі пераклад, нацыянальна-культурная спецыфіка тэксту, індывідуальны стыль пісьменніка, лінгвістычныя і экстралінгвістычныя фактары перакладу.*

**Уводзіны.** Мастацкі пераклад – самы складаны від пісьмовага перакладу, найвышэйшая форма перакладчыцкай дзейнасці. Шматлікія навукоўцы называюць пераклад літаратурных твораў мастацтвам (К.І. Чукоўскі, А.В. Фёдараў, В.С. Вінаградаў). Аднак усякая творчая дзейнасць патрабуе асэнсавання і тэарэтычнага абагульнення, якое дазваляла б атрымаць больш шырокія вывады. "З'яўляючыся творчай дзейнасцю, што збліжае яго з мастацтвам, пераклад, тым не менш, цалкам абапіраецца на навуковыя веды, на тэорыю, якая вывучае заканамернасці перакладчыцкіх рашэнняў і спрабуе аддзяліць магчымае ад немагчымага, дакладнае ад памылковага" [1, с. 357]. У сувязі з гэтым асновай перакладчыцкіх рашэнняў павінен быць глыбокі аналіз мовы перакладаемага тэксту.

**Асноўная частка.** Калі лінгвістычная тэорыя перакладу існуе крыху больш за палову стагоддзя, то літаратуразнаўчы падыход мае значна больш працяглую гісторыю. Доўгі час пытанні тэорыі мастацкага перакладу вывучаліся ў рэчышчы літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі, дзе яны і даследаваліся на працягу папярэдніх стагоддзяў. Пры літаратуразнаўчым падыходзе да перакладу звяртаюцца да асобы перакладчыка, спрабуюць зразумець яго выбар зыходзячы з яго асобасных якасцяў як мастака. Менавіта літаратуразнаўчы падыход дазваляе разглядаць пераклад як мастацтва, такі спосаб адлюстравання рэчаіснасці, у аснове якога ляжыць яе вобразнае засваенне.

Развіццё лінгвістычнай тэорыі перакладу суправаджалася яе рэзкім адмежаваннем ад літаратуразнаўчага падыходу. Упершыню аб неабходнасці стварэння лінгвістычнага перакладазнаўства піша А.В. Фёдараў у сваёй кнізе "Уводзіны ў тэорыю перакладу", якая выйшла ў 1953 г. Даследчык лічыць, што "паколькі пераклад заўсёды мае справу з моваю, заўсёды азначае працу над моваю, ён неадменна патрабуе лінгвістычнага вывучэння – у сувязі з пытаннем наконт характару суадносін дзвюх моў і іх стылістычных сродкаў. Вывучэнне перакладу нават і ў літаратуразнаўчым аспекце ўвесь час сутыкаецца з неабходнасцю разглядаць моўныя з'явы, аналізаваць і ацэньваць моўныя сродкі, якімі карысталіся перакладчыкі. І гэта натуральна, бо змест арыгінала існуе не сам па сабе, а толькі ў адзінстве з формай, з моўнымі сродкамі, пры дапамозе якіх ён ажыццяўляецца, і можа быць перададзены пры перакладзе таксама толькі з дапамогай моўных сродкаў" [2, с. 23].

Такім чынам, у працы А.В. Фёдарава было заяўлена аб фарміраванні лінгвістычнай асновы тэорыі перакладу (у тым ліку і мастацкага). Такая пазіцыя выклікала шматлікія дыскусіі. Перакладчыкі-практыкі бачылі ў новым навуковым кірунку пагрозу мастацкаму перакладу як творчаму працэсу. У публікацыях таго часу сцвярджалася і адстойвалася правамернасць толькі літаратуразнаўчага падыходу да праблемы, падкрэслівалася абмежаванасць лінгвістычнага падыходу да даследавання перакладчыцкай дзейнасці. Такое непрыняцце лінгвістычнай канцэпцыі перакладу тлумачыцца, паводле В.Н. Камісарава, галоўным чынам, дзвюма прычынамі. Па-першае, перакладазнаўства ў цэлым – гэта асаблівая навуковая дысцыпліна, якая мае шматлікія інтэрдысцыплінарныя аспекты. Лінгвістыка можа апісаць і растлумачыць цэлы шэраг найважнейшых фактараў, якія вызначаюць характар і вынікі перакладу, але яна не можа раскрыць усю шматграннасць гэтага складанага віда чалавечай дзейнасці. Па-другое, крытыка лінгвістычнага падыходу да перакладу адвочна зыходзіць з уяўлення аб лінгвістыцы як дысцыпліне, задача якой зводзіцца да апісання розных моўных сістэм. Маецца на ўвазе, галоўным чынам, структурная лінг-

вістыка, якая не цікавіцца семантычным аспектам мовы і не разглядае структуру больш буйных адзінак. Зразумела, што такая мікралінгвістыка, сапраўды, не можа прэтэндаваць на ўсебаковае апісанне перакладчыцкага працэсу. Аднак сучаснае мовазнаўства пераадолела такое абмежаванае разуменне прадмета. Пры макралінгвістычным падыходзе лінгвістычнае перакладазнаўства можа займацца праблемамі, якія традыцыйна лічыліся нелінгвістычнымі [3, с. 3].

Для сучасных поглядаў на мастацкі пераклад характэрна меркаванне, што праблема мастацкага перакладу з'яўляецца комплекснай. Пераклад, як аб'ект, можа вывучацца з розных бакоў, рознымі навуковымі дысцыплінамі (псіхалогіяй, нейрафізіялогіяй, этнаграфіяй і інш.). Выказваюцца патрабаванні аб максімальна беражлівым стаўленні да аб'екта перакладу і аднаўленні яго як твора мастацтва ў адзінстве зместу і формы, у нацыянальнай і індывідуальнай своеасаблівасці. С.А. Скамарохава называе праблему перакладу мастацкай літаратуры адной з найскладанейшых у перакладазнаўстве, бо менавіта мастацкая літаратура з'яўляецца яскравым сведчаннем развіцця пэўнай мовы і культуры [4, с. 93]. Мастацкі пераклад, на думку П.І. Копанева, ёсць найбольш поўнае і натуральнае супастаўленне і ўзаемадзеянне моў, паколькі яны выступаюць і ў арыгінале, і ў перакладзе з аднымі і тымі ж вобразна-эстэтычнымі задачамі і функцыямі і ў найбольш дасканалай форме – у форме мовы мастацкай літаратуры [5, с. 114]. Акрамя таго, мастацкі пераклад з'яўляецца "своеасаблівай формай міжнацыянальных культурных сувязяў і відам міжлітаратурнай камунікацыі, сродкам духоўнага ўзаемаўзбагачэння і збліжэння народаў" [6, с. 3]. Мастацкі пераклад "адносіцца да катэгорыі складаных і расплывістых паняццяў, звязаных з творчым рашэннем задач міжкультурнага і міжлітаратурнага пасрэдніцтва" [7, с. 5].

Тэорыя мастацкага перакладу павінна абапірацца на дадзеныя сучаснай навукі пра мову і маўленне. Паводле А.В. Фёдарава, "з вызначэння мастацтва як мыслення вобразамі, для мастацкай літаратуры выцякае той вывад, што вобразы яе, у адрозненне ад вобразаў іншых мастацтваў, непасрэдна звязаны з мовай, якая з'яўляецца, па вызначэнні А.М. Горкага, яе "першаэлементам". Гэта азначае, што яны заснаваныя на вядомых моўных катэгорыях, і што ў літаратуры сувязь паміж вобразам і моўнай катэгорыяй цесная і непасрэдная. У мастацкай літаратуры моўная форма можа ўступаць у актыўнае ўзаемадзеянне са зместам вобразу або ўсёй сістэмай вобразаў і абумоўліваць характар іх асэнсавання" [2, с. 337]. Такім чынам, моўная спецыфіка мастацкага перакладу заключаецца ў выяўленні моўнай прыроды вобразу і мастацка-сэнсавай функцыі моўных катэгорый. Пераклад мастацкай літаратуры павінен быць максімальна адэкватным і ў перадачы мастацка-эстэтычнага моманту. Ад таго, як і ў якой форме матэрыялізуецца змест залежыць эстэтычная каштоўнасць твора і ўзровень эмацыйна-экспрэсіўнага ўплыву на чытача. Ю.П. Саладуб пад мастацкім тэкстам разумее тэкст, асноўная функцыя якога – эстэтычны ўплыў на чытача ці слухача. Ён лічыць, што адэкватнасць эстэтычнага ўплыву арыгінальнага тэксту і тэксту яго перакладу з'яўляецца галоўным крытэрыем ацэнкі якасці мастацкага перакладу [8, с. 19]. Як адзначае А.В. Фёдараў, "пры фармальнай неперадавальнасці асобнага моўнага элемента арыгінала можа быць узноўлена яго эстэтычная функцыя ў сістэме цэлага і на аснове гэтага цэлага, і перадача функцыі пры перакладзе пастаянна патрабуе змены ў фармальным характары элемента, які з'яўляецца яе носьбітам (напрыклад, выбару іншай граматычнай катэгорыі, слова з іншым рэчыўным значэннем і т.п.)" [2, с. 334]. Літаратурна-мастацкія тэксты "з'яўляюцца вынікам актывізацыі выяўленчых выразных патэнцыялаў мовы арыгінала і перакладу, рэалізуюць яе эстэтычную функцыю шляхам выбару моўных сродкаў паводле комплексных крытэрыяў" [9, с. 5].

Такім чынам, асноўная задача перакладчыка мастацкіх тэкстаў – перадаць эстэтычную каштоўнасць арыгінала, стварыць паўнавартасны мастацкі тэкст на мове перакладу. Для гэтага перакладчыку неабходна зразумець ідэйна-тэматычны змест арыгінальнага тэксту, беражліва ставіцца да вобразнай сістэмы твора і да ідыялекту аўтара. Відавочна, што для ажыццяўлення працэсу перакладу неабходна ўлічваць экстралінгвістычную інфармацыю. Перакладчыку мастацкага тэксту неабходна мець уяўленне пра аўтара твора, яго светапогляд і індывідуальны стыль, пра эпоху, што апісваецца ў творы, а таксама пра ўмовы жыцця грамадства і асаблівасці культуры пэўнага народа.

Для мастацкага перакладу надзвычай важным з'яўляецца адэкватная перадача нацыянальна-культурнай спецыфікі тэксту арыгінала, бо ярка выяўленая нацыянальная афарбоўка зместу і формы – гэта характэрная рыса мастацкай літаратуры. Мастацкі тэкст, як выразнік асаблівасцей мыслення, псіхікі, ментальнасці пэўнага народа, з'яўляецца неацэнным матэрыялам для даследаванняў, бо кожная літаратура – гэта "своеасаблівая паліфанія, дзе зашыфраваны духоўны вопыт нацыі, семантыка нацыянальнай культуры" [10, с. 168]. Адлюстраванне ў мастацкіх творах нацыянальнай ментальнасці надае ёй арыгінальнасць, самабытнасць, робіць сапраўднай выразніцай духоўнай існасці народа. Пераклад у апошні час пачалі разглядаць як культуралагічную з'яву, як від міжкультурнай маўленчай дзейнасці. Паводле Л.К. Латышава і А.Л. Сямёнава, "пераклад – гэта не толькі замена мовы, але і функцыянальная замена элементаў культуры" [11, с. 108]. Ён "перасякае не толькі межы моў, але і межы культур, а тэкст, які ствараецца ў ходзе гэтага працэсу, транспануецца не толькі ў іншую сістэму мовы, але і ў сістэму

іншай культуры” [12, с. 3]. Значную ролю ва ўсталяванні ўзаемаразумення і ўзаемасувязі народаў і культур адыгрывае менавіта пераклад мастацкай літаратуры.

Нацыянальна-культурная інфармацыя ў мастацкім тэксце актуалізуецца праз словы і спалучэнні слоў з нацыянальна-культурнай семантыкай. Яны адлюстроўваюць своеасаблівасць матэрыяльнай і духоўнай культуры народа. Так, нацыянальна афарбаванымі ў беларускім мастацкім творы з’яўляюцца:

1) безэквівалентная лексіка;
2) найменні беларускіх рэалій;
3) размоўная лексіка;
4) парэміі і фразеалагізмы з нацыянальна-культурнай семантыкай;
5) дыялектызмы;
6) свабодныя і ўстойлівыя параўнанні.

Усе названыя вышэй моўныя адзінкі нясуць багатую этнакультурную інфармацыю і з’яўляюцца выразнікамі светапогляду, светаўспрымання і культуры беларускага народа. Паводле А.С. Дзядовай, “мастацкія тэксты, якія найбольш поўна і ўсебакова адлюстроўваюць культуру таго народа, з мовы якога вядзецца пераклад, даюць тлумачэнне карціны свету, сістэмы вобразных сродкаў і нацыянальнай ідыяматыкі, што садзейнічае знаёмству з нацыянальнай культурай і краіназнаўчымі рэаліямі” [13, с. 48].

Пры перакладзе мастацкага твора важна ўлічваць таксама і час стварэння твора, цесную сувязь паміж гістарычным становішчам і вобразамі, якія адлюстроўваюць яго ў творы. Асаблівасці эпохі, гістарычнага развіцця, умоў пражывання, менталітэту характарызуюць наступныя моўныя адзінкі:

1) архаізмы;
2) гістарызмы;
3) антрапонімы;
4) тапонімы;
5) формулы маўленчага этыкету.

Пералічаныя вышэй адзінкі мовы характарызуюць культуру народа ў пэўны гістарычны перыяд, а ў мастацкім тэксце дапамагаюць падрабязна апісаць пэўную эпоху.

Адным з найбольш складаных пытанняў перакладу мастацкай літаратуры з’яўляецца выяўленне і перадача індывідуальнай манеры пісьменніка. Паводле А.В. Фёдарава, “індывідуальная манера аўтара ўяўляе сабой складаную сістэму ўзаемазвязаных асаблівасцяў, якая закранае ўсю тканіну твораў і выяўляецца ў моўных вобразах. Індывідуальная своеасаблівасць магчыма толькі на аснове пэўнай сістэмы моўных катэгорый, якія выкарыстоўваюцца пісьменнікам, на фоне нацыянальна-абумоўленых сродкаў вобразнасці, якія складаюць нацыянальную спецыфіку дадзенай літаратуры, і на фоне пэўнай гістарычнай эпохі, якая стаіць за творам. Іншымі словамі, індывідуальная своеасаблівасць творчасці знаходзіць сваё моўнае выражэнне ў сістэме выкарыстання моўных катэгорый, якія ўтвараюць у сваёй ўзаемасувязі адзінае цэлае са зместам і якія з’яўляюцца носьбітамі нацыянальнай адметнасці і гістарычнай афарбоўкі. Індывідуальны стыль пісьменніка абумоўлены і нацыянальна, і гістарычна [2, с. 333]. Да спосабаў выражэння індывідуальнай манеры пісьменніка ў мастацкім тэксце адносяцца:

1) уласныя імёны (асабліва мянушкі);
2) аказіянальныя лексічныя і фразеалагічныя адзінкі;
3) вобразныя азначэнні;
4) метафара;
5) трапныя параўнанні;
6) сінтаксічныя фігуры (інверсія, паўтор і інш.).

Вышэйназваныя сродкі дазваляюць глыбей зразумець асаблівасці стылю пісьменніка, яго светапогляд, спасцігнуць ідэйна-эстэтычныя задачы аўтара. Праз уласныя імёны прасочваюцца адносіны пісьменніка да персанажа, сцвярджаецца аўтарская ідэя твора, ствараюцца яскравыя мастацкія вобразы. Выкарыстанне аказіянальных лексічных і фразеалагічных адзінак разлічана на дасягненне пэўнага стылістычнага эфекту, гэта найбольш індывідуалізаваныя сродкі моўнага выражэння. Тропы і фігуры з’яўляюцца таксама надзвычай актыўнымі выразнікамі аўтарскага светабачання.

**Заключэнне.** Мастацкі пераклад – гэта складаны і шматгранны від чалавечай дзейнасці, у працэсе якой сутыкаюцца розныя культуры, розныя эпохі, розныя традыцыі. Пры ажыццяўленні перадачы мастацкага тэксту на іншую мову мы маем справу не столькі з перакладам у яго традыцыйным разуменні, колькі з асаблівым відам міжкультурнай, культурна-этнічнай і мастацкай камунікацыі. Мастацкі пераклад у роўнай ступені факт і моўны, і літаратурны; яму ўласцівы адхіленні ад максімальна магчымай сэнсавай дакладнасці з мэтай забеспячэння большай мастацкасці тэксту перакладу. Даслоўны пераклад немагчымы ўжо ў сілу таго, што розныя мовы адрозніваюцца як па граматычным ладзе, так і па колькасці слоў, не кажучы ўжо пра адрозненне культур, што таксама ўплывае на спосаб і вынікі перакладу. Пры сэнсавай эквівалентнасці тэкстаў арыгінала і перакладу не заўсёды магчыма дасягнуць эквівалентнасці асобных адзінак. Усе моўныя сродкі, выкарыстаныя пісьменнікам, залежаць ад зместу твора,

індывідуальнай пазіцыі аўтара. Такім чынам, мастацкі тэкст як аб’ект перакладу мае шэраг адметных уласцівасцяў, якія ўплываюць як на працэс, так і на якасць перакладу. Пры ажыццяўленні працэсу мастацкага перакладу павінны ўлічвацца як лінгвістычныя, так і экстралінгвістычныя фактары.

ЛІТАРАТУРА

1. Гарбовский, Н.К. Теория перевода : учебник / Н. К. Гарбовский. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 2004. – 544 с.
2. Фёдоров, А. В. Основы общей теории перевода (лингвистические проблемы) : учеб. для ин-тов и фак. иностр. яз. / А. В. Фёдоров. – 5-е изд. – СПб. : Филологический факультет СПбГУ ; М. : ООО «Издательский Дом «ФИЛОЛОГИЯ ТРИ», 2002. – 416 с.
3. Комиссаров, В. Н. Общая теория перевода / В. Н. Комиссаров. – М. : ЧеРо, 2000. – 136 с.
4. Скамарохава, С. А. Пераклады В. Рыч беларускай паэзіі на англійскую мову / С. А. Скамарохава // Весн. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітарных навук. – 2005. – № 1. – С. 93–100.
5. Копанев, П. И. Вопросы истории и теории художественного перевода / П. И. Копанев. – Минск : Изд-во БГУ, 1972. – 295 с.
6. Дзянісава, Н. В. Аўтарскі пераклад : праблема аўтарскага перакладу прозы ў беларускай літаратуры XX стагоддзя / Н. В. Дзянісава ; пад рэд. В. Рагойшы. – Мінск : БВТ “Хата”, 2002 – 100 с.
7. Казакова, Т. А. Художественный перевод : учеб. пособие / Т. А. Казакова. – СПб. : Санкт-Петербургский институт внешнеэкономических связей, экономики и права, 2002. – 113 с.
8. Солодуб, Ю. П. Теория и практика художественного перевода : учеб. пособие для студ. лингв. фак. высш. учеб. заведений / Ю. П. Солодуб, Ф. Б. Альбрехт, А. Ю. Кузнецов. – М. : Издательский центр «Академия», 2005. – 304 с.
9. Галубенка, І. В. Лексіка-стылістычная эквівалентнасць беларускіх перакладаў рускай прозы : на матэрыяле рускага савецкага апавядання : дыс. ... канд. філал. навук : 10.02.01 ; 10.02.02 / І. В. Галубенка. – Мінск, 2002. – 129 л.
10. Мельнікава, А. М. Мастацкі тэкст як фактар нацыянальнага / А. М. Мельнікава // Текст в лингвистической теории и в методике преподавания филологических дисциплин : материалы II Междунар. науч. конф., Мозырь, 26 – 27 марта 2003 г. : в 2 ч. / Мозырский гос. пед. ун-т; редкол : С. Б.Кураш [и др.]. – Мозырь, 2003. – Ч. 2. – С. 168–170.
11. Латышев, Л. К. Перевод : теория, практика и методика преподавания : учеб. пособ. для студ. перевод. фак. высш. учеб. заведений / Л. К. Латышев, А. Л. Семёнов. — М. : Издательский центр «Академия», 2003. – 192 с.
12. Иванова, Ю. В. Обучение переводу художественных произведений как виду межкультурной речевой деятельности : метод. рекомендации для преподавателей теории и практики перевода / Ю. В. Иванова; под ред. И. А. Цатуровой. – Таганрог : Изд-во ТРТУ, 2004. – 42с.
13. Дзядова, А. С. Этналінгвістыка : курс лекцый / А. С. Дзядова. – Віцебск : УА “ВДУ імя П. М. Машэрава”, 2010. – 93 с.

*Паступіў 29.05.2017*

## THE SPECIFICITY OF LITERARY TRANSLATION: LINGUISTIC AND EXTRALINGUISTIC ASPECTS

***H. STARASTSINA***

*The article deals with the specificity of literary translation. The process of formation of the linguistic theory of translation is described. It is noted that the problem of literary translation is complex, should be studied comprehensively and rely on the data of modern linguistics. It is emphasized that literary translation should be as adequate to transfer the aesthetic value of the original, its cultural identity. When translating a work of art should be considered ethno-cultural information, especially age, personal style of the author. The article analyzes the linguistic units that reflect the national cultural specificity of the text, time of creation, the individual style of the writer. The author comes to the conclusion that the implementation process of translation of a literary text should take into account both linguistic and extralinguistic factors.*

***Keywords:*** *linguistic theory of translation, literary translation, the national cultural specificity of the text, the individual style of the writer, linguistic and extralinguistic factors of translation.*